ПІЦЬ — ХВАРОБУ ЛЯЧЫЦЬ...

Не вам казаць: з некім лёс зводзіць, з некім разводзіць, а потым, здараецца, зводзіць зноў...

У 1970-х гадах мінулага стагоддзя мы са спадарыняй Людмілай разам працавалі на Жлобіншчыне ў камсамоле, які, дарэчы, яе «малітвамі» існуе і цяпер. Больш за тое, ён нават дзейнічае, бо пра сваіх (і не толькі) у гэтай арганізацыі па-ранейшаму помняць: гуртуюць на добрыя справы, дапамагаюць чалавеку, калі той патрапіў у бяду... Вось і мяне знайшлі па газеце — зноў «залічылі ў рады», час ад часу цяпер тэлефануюць, і размаўляем мы тады, вядома ж, не пра сходы і суботнікі, не пра ўзносы ды рэйды. Цяпер можна пагутарыць пра сваё, пра «дзявочае» — шмат што расказаць, а ўжо пачуць...

Мне, напрыклад, цікава было даведацца, што спадарыня Людміла з праваслаўнага шляхецкага роду Зарэцкіх. Раней яна пра гэта ніколі не згадвала. Ды яно і зразумела: дзецям прывіваліся іншыя погляды, і ў маленстве, напрыклад, Люда апантана верыла ў камунізм. Расказвала, што ў дзень выбараў (калі можна іх так называць?) прачыналася а чацвёртай раніцы і тут жа пачынала грукаць — будзіць бацькоў ды суседзяў гучным заклікам: «Усе на выбары!», «Усе на выбары!..»

Потым ёй за гэта, вядома ж, перападала, але малая не здавалася: яе не гнулі ніякія дамашнія «рэпрэсіі»! Яе нават у камсамол прынялі раней за іншых: дамаглася — зрабілі выключэнне.

Карацей, яна шмат што расказвае. Бывае, нават з сумнага насмяешся.

Ну дык вось. Да нейкага і зусім нядаўняга часу ніякіх таблетак яна не піла — увогуле. А тут — скуль ні вазьміся — сэрца прыхапіла, падазрэнне на інфаркт. «Хуткая» прыляцела, яе на насілкі «грузяць», у машыну нясуць. Доктар, на хаду распытвае пра папярэднія сімптомы ды меры, якія прымаліся:

— Што пілі? — удакладняе, маючы на ўвазе лекі.

А хворая ж па-свойму разумее. Кажа:

— «Амарулу».

Доктар слова падобнае чуў: «Амарэта»? Лікёр? Ім, як быццам, не пахне? Таму зноў пытае:

— Калі?

— Даўнавата... На жаль.

— А якімі дозамі?

— Прычым тут дозы, — пачынае злавацца хворая. — У нас бутэлька была. Мы сабраліся з дзяўчатамі — свята адзначыць...

— Яны што — таксама «Амарэтай» лячыліся?

— Мы не лячыліся, а святкавалі, — Людміла кажа, бо яна ж чалавек прынцыповы. — І не «Амарэтай», а «Амарулай». Гэта расліна такая — паўднёваафрыканская. З яе лікёр там робяць. Сын прывёз.

— Ах вось яно што! — засмяяўся доктар.

І Людміла з палёгкай, што ўсё ж растлумачыла, справу зрабіла, «адплыла» — страціла прытомнасць.

...Як вядома, добра ўсё, што добра канчаецца. Жанчына, дзякаваць богу і дактарам, выкараскалася, далей жыве. І ведае цяпер, што піць можна не толькі чай ды — пакрысе — «Амарэту» з «Амарулай», а яшчэ і таблеткі.

Соф'я Кусянкова,
в. Лучын, Рагачоўскі раён.

ХАЦЕЛА ЯК ЛЕПЕЙ

...Бабулі ноччу
дрэнна спіцца,
Бо многа спраў
на заўтра ёсць:
Прыедзе ўнучка
са сталіцы —
Найдаражэйшы
ў хаце госць!
Здаецца,
«учора» калыхала,
Любіла кніжкі з ёй чытаць,
Спявала,
нешта майстравала,
У парк вадзіла пагуляць...
А сёння
ўжо чакай сустрэчы,
Пячы аладкі — частаваць...
І пацяплее зімні вечар,
Калі былое ўспамінаць.

Унучка здымкі ёй пакажа
З чужых паездак і сваіх,
Пра свет далёкі
штось раскажа,
Які бабуля помніць з кніг...

Адкрыта госця гаварыла,
І дзе была, і што піла...
(А роднай мовы —
не забыла,
Хоць доўга
між чужых жыла!)
Бабуля слухае і чуе:
Пра светлы Рым
і Ватыкан...
Ды ціха нешта маракуе —
На ноч складае
ўласны план.

Унучка спаць,
яна за іголку,
Бо новы клопат захапіў:
Тканіны моцнай
кроіць полку,
Што на спадніцу
дзед купіў...
Да джынсаў
латкі прымярала —
Падбіць калені трэба ёй:
І дзеўка, бачыш,
а парвала...
Хадзіць нядобра
так зімой...

Старанна, спрытна
бабця шыла,
Бо звычка гэтая здаўна:
Хадзіць
у лапленым вучыла
Яе праклятая вайна.
Гадамі новага не знала:
Ў сям'і малодшаю была,
Ёй маці
штось перашывала,
Пакуль на хлеб свой
не пайшла...

Закончыла
ў поўнач працу —
Паклала госці на вачах:
Прачнецца ранкам —
тут жа ўбачыць,
І скажа: «Ой!..»,
ці, можа, «Ах!»

Сама ўстала... Пазірае...
А там — не радасць,
ледзь не плач!..
Майстрыху
ўнучка абдымае:
— Бабулька,
дзякуй і... прабач.

Леанарда Аляшкевіч,
г. Смаргонь.

АСЦЯРОЖНА, ДЗВЕРЫ ЗАЧЫНЯЮЦЦА...

Некалі ў гады перабудовы накіравалі мяне на практыку ў РАПА — раённае аграпрамысловае аб'яднанне. Там, на месцы, сталі паціху знаёміць са справамі і людзьмі, а нешта я і сам ужо прыкмячаў...

Помню, што адразу і вельмі здзівіла — дзверы ў кабінет намесніка дырэктара заўсёды былі насцеж. Ён і сам іх ніколі не зачыняў, і іншым не даваў. «Вось гэта, думаю, адкрытасць! Вось гэта галоснасць... Усё навідавоку...»

З часам мой новы калега расказаў, чаму.

Многія раённыя начальнікі па калгасных палях ды лугах «рассякалі» тады на «Масквічах-пікапах». Іх называлі яшчэ то «каблучкамі», то «піражкамі», то «бабавозкамі»... Вельмі зручны быў транспарт. Па-першае, на ім можна было нікога не падбіраць, не падвозіць, бо ў кабіне адно толькі месца для пасажыра, а па-другое, фургон вялікі, у ім што заўгодна можна схаваць.

Дык вось як выйшла. Ездзіў той намеснік дырэктара па нейкіх справах і па дарозе сустрэў свайго прыяцеля, трохі падвёз яго, пагаварылі — захацелі выпіць. Збочылі недзе ў краму, купілі, што трэба, і на прыроду, у лес...

Ад'ехалі ад чужых вачэй, аднак пасядзець там не выпала: нейкі вецер узняўся, дождж зацерушыў...

У кабіне «Масквіча» — удвух ды з пляшкай-закускай — таксама не спадручна было. Таму прыяцелі перайшлі ў кузаў, знайшлі там на што сесці, з чаго зрабіць столік і... Выпілі па першай, па другой, па трэцяй, закусілі, вядуць гамонку.

А тым часам міма іх калгасны статак гоняць, пастух за ім следам ідзе, пугай кветкі збівае. Бачыць, што ў машыне пуста — нікога няма, а гутарка аднекуль даносіцца. Чалавеку цікава стала. Ён, што называецца, нос у будку:

— Добры дзень! — людзям кажа.

А начальніку здалося, што гэта ж ён у сваім кабінеце сядзіць... І да яго высокасці хтосьці без стуку без груку...

— Дзверы з тога боку зачыні! — гаркнуў ён.

Ну а пастух нічога такога, відаць, не чакаў і дзвярыма сапраўды як ляснуў...

Прычым ляснуў і тут жа сышоў — свой статак даганяць. А ручка ў дзверцах была толькі знадворку. Так што запёр ён двух прыяцеляў. І запёр надзейна...

Што яны там рабілі, колькі гадзін у «засценках» правялі і што адчувалі (тэлефонаў мабільных і ў паміне тады не было), гісторыя замоўчвае. Але ж, падобна, што ліха аж па горла хапілі, бо знайшлі іх толькі назаўтра.

Вось таму і не дзіва, што той намеснік дзвярэй не зачыняў. Нават праз гады.

Віталь Жураўскі,
г. Жодзіна.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Финансово-образовательный местный фонд «УоллСтрит» (далее – Фонд) зарегистрирован решением Главного управления юстиции Минского городского исполнительного комитета № 16 от 3 мая 2016 г. Свидетельство о государственной регистрации № 05/0082. Учетный номер плательщика 194904583. Адрес местонахождения: 220140, г. Минск, ул. Домбровская, д. 9, офис 9.1.4.

ОТЧЕТ
об использовании финансово-образовательным местным фондом «УоллСтрит» своего имущества за 2018 год

Учредителями Фонда являются граждане Республики Беларусь (два физических лица).

Стоимость имущества Фонда по состоянию на 1 января 2019 года составляет 1 105 723,49 белорусских рубля. Фонд не создавал, не учреждал и не участвовал в унитарных предприятиях и хозяйственных обществах.

В 2018 году Фонд производил следующие виды расходов: на цели благотворительности; на оплату труда работников (включая начисления); на служебные командировки, деловые поездки и встречи; на содержание арендованного и иного имущества (транспорт, офисное оборудование, иное); на приобретение основных средств, инвентаря и иного имущества; на уплату налогов и прочих обязательных платежей в бюджеты различного уровня. Всего было израсходовано денежных средств на сумму 2 176 463,43 белорусского рубля.

Фондом, в процессе проведения социальных мероприятий, было использовано имущество в виде сувенирной, печатной и канцелярской продукции, с ее передачей на безвозмездной основе физическим лицам.

Фонд на возмездной основе предоставил микрозаймы физическим лицам, осуществляющим ремесленную деятельность, деятельность по оказанию услуг в сфере агроэкотуризма, ведение личного подсобного хозяйства, являющимся собственниками имущества, учредителями (участниками) коммерческих организаций на общую сумму 1 455 000,84 белорусского рубля.

Фонд получил поступления денежных средств от деятельности по предоставлению микрозаймов и от иных поступлений, не запрещенных законодательством, в размере 3 154 088,32 белорусского рубля.

УНП 194904583

Отчет местного благотворительного фонда «Возрождение историко-культурных ценностей Шкловского района» об использовании своего имущества за 2018 год

Местный благотворительный фонд «Возрождение историко-культурных ценностей Шкловского района» информирует о продолжении своей деятельности согласно Уставу по адресу: 213004, Республика Беларусь, Могилевская область, город Шклов, улица Ленинская, дом 49.

1. Учредители фонда: Дедков Алексей Владимирович, Дроздова Ирина Александровна, Еремич Николай Григорьевич, Марфель Галина Васильевна, Пименов Александр Александрович, Сергеенко Светлана Федоровна, Силивестрова Лариса Валентиновна, Сурков Сергей Владимирович, Тарасова Екатерина Александровна, Шинкевич Галина Валерьевна.

2. Информация о стоимости имущества фонда:

имущество, переданное фонду его учредителями, – нет;

доходы, полученные от добровольных взносов и пожертвований граждан и организаций, – 275000,00 (двести семьдесят пять тысяч российских рублей);

доходы, получаемые от осуществляемой в соответствии с уставом предпринимательской деятельности, – нет;

иные не запрещенные законодательством, поступления – 12,59 (двенадцать белорусских рублей пятьдесят девять копеек).

3. Информация об общей сумме расходов, понесенных фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в уставе:

расходы фонда, не запрещенные законодательством Республики Беларусь, – 933157,26 (девятьсот тридцать три тысячи сто пятьдесят семь российских рублей двадцать шесть копеек).

4. Фонд не является учредителем унитарных предприятий, хозяйственных обществ и не участвует в создании других юридических лиц.

УНП 790613326

Неасабісты суб'ектыў

НАСТУПНЫ ПРЫПЫНАК

Пакуль шкадуеш сам сябе — ці будзеш паважаць?

УЧОРА быў чарговы Дзень роднай мовы. Нагадаў пра тое на досвітку ўключаны на кухні тэлевізар: яшчэ не паспеў засвяціцца экран, а з дынамікаў ужо лілася добрая беларуская гаворка вядучых ранішняй праграмы. Гаварылі яны нязмушана, з усмешкамі, нібы гэта справа для іх звыклая, штодзённая, — адна асалода чуць. А выйшаўшы са студыі, пэўна, тут жа перайшлі на іншую дзяржаўную, якая для іх (як і для многіх-многіх нашых суграмадзян), па сутнасці, і ёсць родная. І не трэба на мяне коса глядзець і абвінавачваць ва ўсіх магчымых грахах за гэту ўсяго толькі канстатацыю бясспрэчнага факта. Бо гэта сапраўды так. Бо родная мова, паводле нармальнага агульнапрынятага разумення, — гэта мова, на якой ты пачуў і сказаў першыя словы, на якой ты нязмушана думаеш і свае думкі выказваеш. Калі па гэтай зразумелай формуле рабіць высновы, адкінуўшы ўсю лірыку, кшталту «не ведаю, не размаўляю, але ж люблю і лічу роднай» (гэта вельмі зручная пазіцыя, дарэчы, вынайдзеная менавіта беларусамі, прычым не сёння і не пазаўчора), дык карціна атрымаецца вельмі нават невясёлая. І колькі ні паўтарай у транспарце: «Наступны прыпынак...», больш аптымістычнай яна не становіцца.

ЧАГО ж нам не хапае, каб загаварыць па-беларуску, каб загаварылі па-беларуску нашы дзеці? Бо стаўленне да мовы — абсалютна шчыра — амаль ва ўсіх за рэдкімі, вельмі рэдкімі сёння выключэннямі — прыязнае і добразычлівае. Але адна справа стаўленне, зусім іншая — дзеянне. Нядаўна мама чатырохгадовай дзяўчынкі з замілаваннем расказвала, як малая, прыходзячы з садка, гаворыць «дзякуй», «добры дзень», «смачна есці» — дзетак мове навучаюць там ужо з сярэдняй групы. «А потым яна просіць пачытаць ёй беларускую кніжку. Я пачынаю чытаць, а яна перапытвае: а што такое «бусел»? а «шкарпэтка»? Даводзіцца тлумачыць, перакладаць, бо яна сапраўды не разумее. Дык гэта ж не чытанне, а мука нейкая — ніякага цярпення не хопіць! Так тыя кніжкі ў нас на паліцы і ляжаць без справы. Я хачу, каб малая і беларускую мову ведала, але неяк, напэўна, вывучыць сама. Няма мне часу з гэтым важдацца...»

У чым прычына такой вельмі тыповай для нашага грамадства пазіцыі? І давайце не будзем тут прыплятаць дзяржаву, сістэму адукацыі, іншыя агульныя катэгорыі, згадванне якіх ужо, шчыра кажучы, набіла аскому. Мне ў адной такой спрэчцы калега заявіў: калі «паны» не загавораць, дык і «мужык» — нізавошта. Але ж менавіта тыя самыя мужыкі, нашы пра-пра-пра... на працягу некалькіх стагоддзяў, калі іхняя мова была практычна забароненая і існавала толькі ў вуснай форме, калі сапраўдныя паны на ёй дакладна не гаварылі, гэту мову для нас, сваіх нашчадкаў, і зберагліі. Выходзіць, яны, «паны касы і сахі», у лапцях ды світках, былі больш адказныя, больш свядомыя ў захаванні роднага слова?..

ШЧЫРА кажучы, я вельмі часта думаю над падобным парадоксам. І ведаеце, да якой высновы прыйшла? Не будзе паўнавартасна і годна жыць той, хто сам сябе шкадуе і правакуе іншых на шкадаванне. Бо шкадаванне і павага — часцей за ўсё рэчы несумяшчальныя. Так і з мовай. Вы ведаеце што-небудзь пра літаратурныя творы, прысвечаныя англійскай мове? А нямецкай? А французскай? Дый нават пра рускую ўспомніш толькі бравурнага Маякоўскага, які безапеляцыйна заяўляе, што вывучыў бы яе толькі за тое, «что им разговаривал Ленин!». А што ў нас, людцы мае, — суцэльныя «Песні жальбы»! «Не пакідайце ж...», «Паверце, вашай ён не ўкраў...», «Толькі месяцаў назвы пакіньце...», «Ці плачу я, ці пяю...» Класікі, канешне, пісалі пра тое, што ім баліць. Але і сёння, праз сто дваццаць восем, сто дванаццаць, пяцьдзясят пяць гадоў пасля таго, як пісаліся гэтыя радкі, мы працягваем мысліць тымі самымі катэгорыямі. Датычна да беларускай мовы мы саромеемся, апраўдваемся, плачамся, заклікаем. Мы, што, чакаем, што нас хтосьці пашкадуе, суцешыць, пагладзіць па галаве і дасць цукерку ў выглядзе закліку «Гавораць усе!»?

ЧАГО і ад каго мы яшчэ чакаем? Чаму ў адносінах да мовы нам, такім адукаваным і «прасунутым», больш зручна адчуць сябе ўсё тым жа забітым мужыком-селянінам, які сарамліва бубніць: «А каб цёмны не быў, чытаць кніжкі ўмеў»... Дык бяры і чытай — хто табе не дае?! Вунь іх колькі — у кнігарнях, у бібліятэках, у сеціве. Статус дзяржаўнай мовы незалежнай краіны ёсць, права атрымліваць на ёй адукацыю таксама, права размаўляць на ёй маем ад нараджэння. Вядучыя камп'ютарныя платформы маюць беларускую раскладку клавіятуры, сацыяльныя сеткі размаўляюць па-беларуску. Нават у транспарце нам ветліва паведамляюць пра «наступны прыпынак». І дзяцей у садках вучаць (робяць гэта за нас) гаварыць «дзякуй» і «добры дзень». А вось пачуццё гонару і годнасці ні ў якім законе не прапішаш. Гэта павінны мы самі. Самі, бо акрамя нас, нікому гэта і не патрэбна.

Вось пра гэта я і хацела сказаць вам назаўтра пасля Дня роднай мовы. Так бывае пасля свята — калі эйфарыя праходзіць і ў галаву розныя не вельмі прыемныя думкі лезуць...

Алена ЛЯЎКОВІЧ.